# ХОЧАШ ПРАГАЛАСАВАЦЬ — УДАКЛАДНІ

**Пачынаючы з 9 лютага выбаршчыкі маюць права звярнуцца ва ўчастковую выбарчую камісію па месцы сваёй рэгістрацыі і ўдакладніць, ці ўключаны яны ў спіс выбаршчыкаў, а таксама праверыць правільнасць указаных аб іх звестак.**

Калі грамадзянін мае жаданне прагаласаваць не па месцы рэгістрацыі, а па месцы пражывання, то ў яго ёсць права звярнуцца ва ўчастковую выбарчую камісію па месцы пражывання ў перыяд з 9 да 24 лютага 2024 года. Чалавек можа быць уключаны ў спіс выбаршчыкаў па месцы пражывання на падставе пашпарта (ідэнтыфікацыйнай карты) грамадзяніна Рэспублікі Беларусь і пры наяўнасці дакумента, які пацвярджае пражыванне на тэрыторыі ўчастка для галасавання (напрыклад, дагавора куплі-продажу, дагавора найму, зарэгістраванага ў выканкаме, або іншага дакумента, які пацвярджае пражыванне).

У адзіны дзень галасавання — 25 лютага 2024 года — уключэнне ў спіс выбаршчыкаў, якія не зарэгістраваны на тэрыторыі ўчастка для галасавання, не прадугледжана законам.

З 9 да 19 лютага 2024 г. участковыя выбарчыя камісіі працуюць з панядзелка да пятніцы з 17.00 да 19.00, у суботу — з 12.00 да 14.00.

**Вераніка КАНЮТА.**